Кудрыцкі У.І.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## ФІЗІЧНЫЯ ПРАКТЫКАВАННІ ЯК СРОДАК ВЫВЯДЗЕННЯ РАДЫЁНУКЛІДАЎ З АРГАНІЗМА СТУДЭНТАЎ НА ЗАНЯТКАХ У СПЕЦМЕДГРУПАХ

Прайшло больш за восем гадоў з дня чарнобыльскай катастрофы, але, на жаль, яшчэ вельмі мала мы маем канкрэтных рэкамендацый па выводзенні радыёнуклідаў з арганізма чалавека. Між тым вядома, што мэтанакіраваныя практыкаванні паспяхова дапамагаюць вырашэнню гэтай праблемы. Улічваючы важнасць гэтага пытання, мы выраішылі правесці аналіз індывідуальных карт усіх студэнтаў Беларускага універсітэта культуры з мэтай выяўлення студэнтаў, у якіх асноўным месцам жыхарства з'яўляецца чарнобыльская зона. Так, на факультэце мастацкай творчасці іх вучыцца 68 чалавек, на факультэце культуралогіі - 51, на факультэце бібліятэчна-інфармацыйных сістэм - 24 студэнты. Гэтыя студэнты займаюцца фізвыхаваннем у асноўных групах, а 31 чалавек - у спецмедгрупе. Усе яны ў той альбо іншай ступені падвергліся ўздзеянню радыёнуклідаў: I - 131, Cs - 137, Sr - 90, якія назапашваюцца ў шчытападобнай залозе, нырках, печані і мышцах.

З мэтай выводзення радыёнуклідаў з арганізма студэнтаў мы на занятках па фізвыхаванні ў спецмедгрупе ўжывалі розныя практыкаванні для мышцаў спіны, жывата, мышцаў малога таза, а таксама дыяфрагмальнае дыханне і масаж у вобласці печані і шчытападобнай залозы. Гэтыя практыкаванні паляпшаюць дзейнасць органаў мочапалавой сістэмы, агульны абмен рэчываў, гэтым самым паскараюць выводзенне з арганізма радыёнуклідаў.

Акрамя гэтага, мы прапанавалі студэнтам ужываць у ежу прадукты з вялікім утрыманнем кальцыю і калію, каб блакіраваць накапленне Sr (стронцыя) - 90 і Cs (цэзія) - 137.

З мэтай прафілактыкі накаплення ў зале газу радону мы часта праветрывалі і кварцавалі памяшканне.

У канцы заняткаў суб'ектыўна студэнты адзначалі агульнае паляпшэнне свайго стану: павышэнне эмацыянальнага і мышачнага тонусу, бадзёрасць, добрае адчуванне і настрой, знікненне санлівасці, млявасці, абыякавасці і кружэння галавы. Павялічвалася частата мочавыдзялення (дыурэз), узмацнялася потавыдзяленне, што садзейнічала выводзенню радыёнуклідаў з арганізму.

Зыходзячы з вышэйвыкладзенага можна зрабіць заключэнне, што выкарыстанне спецыяльна накіраваных фізічных практыкаванняў спрыяе у некаторай ступені актывізацыі мочапалавой сферы і праз яе паскарае выводзенне радыёнуклідаў з арганізма чалавека.

Мы спадзяёмся, што нашы намаганні будуць садзейнічаць паляпшэнню агульнага стану здароў'я будучых спецыялістаў культурна-асветнай дзейнасці, якія свае веды па гэтай праблеме, набытыя на занятках па фізвыхаванню, будуць выкарыстоўваць у жыцці.

Асінцава Л.І.,
канд.эканам.навук,
дацэнт

## ЭКАНАМІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ Ў СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ

Вышэйшая адукацыя ў Беларусі знаходзіцца ў стане рэканструкцыі ўжо на працягу доўгага часу. І хаця гэты працэс яшчэ не набыў характару кардынальнага абнаўлення і ўдасканальвання падрыхтоўкі кадраў для народнай гаспадаркі, ужо сфармулявалася думка аб неабходнасці гуманізацыі ўсёй сістэмы вышэйшай адукацыі. Ажыццяўленне гэтай ідэі немагчыма без глыбокага засваення студэнтамі азначанага мінімуму ведаў па агульных гуманітарных і спецыяльна-эканамічных дысцыплінах, такіх як філасофія, эканоміка, гісторыя, культуразнаўства, сацыялогія і інш.

Неабходнасць эканамічнай адукацыі для спецыяліста з універсітэцкім дыпломам відавочна і сёння не мае патрэбы ў аргументацыі. Разам з тым у рэспубліцы яшчэ не выпрацавана прымальная канцэпцыя выкладання эканамічных дысцыплін у сістэме вышэйшых навучальных устаноў рознай прафесійнай накіраванасці.

Адной з першых праблем, якая патрабуе рашэння, з'яўляецца азначэнне мінімуму зместу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і ўзроўню падрыхтоўкі студэнтаў па эканамічнай тэорыі. Студэнт, завяршыўшы вывучэнне гэтага курса, павінен паказаць веданне асноў эканамічнай тэорыі, разуменне сітуацый на мікра- і макраўзроўні, асабліва сітуацый, якія звязаны з інфляцыяй, уздымам, спадам вытворчасці, разуменне сутнасці ўрадавых рашэнняў у галіне сацыяльна-эканамічнай палітыкі, уменне арыентавацца ў бягучых эканамічных пытаннях, валодаць ведамі аб асноўных прадстаўніках сусветнай і айчыннай эканамічнай думкі.

Другая праблема заключаецца ва ўліку профілю навучальнай установы ў выкладанні дысцыпліны.

Сёння ў Беларускім універсітэце культуры існуе праграма курса "Эканамічная тэорыя і эканоміка культуры",якая прадугледжвае двухузроўневую эканамічную падрыхтоўку студэнтаў. Пасля вывучэння асноў эканамічнай тэорыі студэнтам выкладаецца курс, у якім разглядаецца эканамічны механізм функцыянiравання ў галіне культуры.

На жаль, гэта ініцыятыва, падтрыманая ва універсітэце на ўсіх узроўнях, мела негатыўныя вынікі для выкладання ўласна эканамічнай тэорыі, паколькі на новы курс па эканоміцы культуры не было выдзелена ніводнай гадзіны.Пры поўнай адсутнасці падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па курсу выкананне вышэй адзначаных патрабаванняў да эканамічнай падрыхтоўкі студэнтаў нерэальна.

Пры ўсім тым нельга сказаць, што дэканаты факультэтаў і загадчыкі спецыяльных кафедраў не ўсведамляюць неабходнасці эканамічнай адукацыі спецыялістаў сферы культуры. Адкрыццё спецыяльнасці "мэнеджэр сацыяльна-культурнай сферы", выкладанне бібліятэчнага маркетынгу і іншых эканамічных курсаў сведчаць аб разуменні такой неабходнасці. Аднак пры адсутнасці каардынацыі выкладання эканамічных дысцыплін цалкам быў парушаны прынцып паслядоўнасці і пераемнасці іх вывучэння. Паралельнае выкладанне эканамічнай тэорыі і спецыяльных эканамічных курсаў, тым больш выкладанне шэрагу эканамічных дысцыплін да таго, як студэнты атрымаюць асновы эканамічных ведаў, з'яўляецца сведчаннем непрафесійнага падыходу да ўдасканальвання эканамічнай адукацыі.

Перад выкладчыкамі эканамічных дысцыплін стаяць і іншыя неадкладныя праблемы. Эканамічнай навуцы яшчэ трэба будзе заняць сваё дастойнае месца ў абноўленай вышэйшай школе.

Елісеева Г.М.,
выкладчык

## "САЦЫЯЛОГІЯ КУЛЬТУРЫ" Ў СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТА

Перамены, якія адбыліся ў XX стагоддзі, дазволілі паставіць пытанне аб новых падыходах да разумення сацыялагічных ведаў. У такой сітуацыі ўзнікае пытанне: што павінна даць сацыялогія студэнту, які займецца ў ВНУ? Адказ можа быць такім: арыентацыю ў складаным сучасным грамадстве, закончаную сістэму ведаў і трывалых ісцін.

Але, на жаль, сацыялогія ўсё яшчэ працягвае заставацца ў стадыі "станаўлення". Сёння яна толькі прапануецца і ў вучэбныя планы ўводзіцца па жаданні кіраўніцтва ВНУ, г.зн. не ўключаецца пакуль у лік абавязковых дысцыплін. Тут выяўляецца агульнае падзенне прэстыжу грамадскіх навук, адсутнасць падручнікаў, недастатковасць вопыту. Таму разлічваць на закончаную сістэму ведаў студэнтаў пакуль яшчэ не прыходзіцца.

Калі мы хочам, каб сацыялогія "прыжылася" ў ВНУ, то павінны ў першую чаргу паклапаціцца аб прывабнасці яе для студэнтаў і кіраўнікоў навучальных устаноў.

Як гэтага дасягнуць?

Сацыялогія ёсць шырокая сацыялагічная тэорыя, якая вывучае грамадства ў цэлым. Для вывучэння ў ВНУ з сацыялагічнай навукі неабходна адабраць такія тэмы, якія дазволяць студэнтам больш умела рашаць свае прафесійныя і агульначалавечыя праблемы, улічваць спецыфіку ВНУ, сувязь сацыялогіі з іншымі дысцыплінамі.

Выкладанне сацыялогіі культуры ў нашым ВНУ патрабуе асобнага міжпрадметнага кантакту, таму што побач з сацыялогіяй культуры выкладаюцца такія дысцыпліны, як тэорыя культуры, культуралогія, эканоміка культуры і іншыя, цесна звязаныя з катэгорыяй "культура". Сацыялогія культуры - галіновая сацыялагічная тэорыя, якая вывучае заканамернасці функцыяніравання культуры ў грамадстве, распаўсюджванне, захоўванне і спажыванне культурных каштоўнасцей. Займаецца гэта навука таксама прагназіраваннем развіцця культуры. Культуралогія ж і тэорыя культуры разглядаюць пытанні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ